**Каждый Участник Рекламной игры может выиграть не более одного приза. В случае повторного попадания на уже Победившего Участника Рекламной игры, выигрышным считается следующий по списку Игровой номер Участника Рекламной игры.**

При проведении розыгрыша дополнительно определяются Резервные Победители **Приза 1, Приза 2, Специального приза от Visa 1, Специального приза от Visa 2, Специального приза от Visa 3, Специального приза от Visa 4.** Резервными Победителями, выигравшими **Приз 1, Приз 2, Специальный приз от Visa 1, Специальный приз от Visa 2, Специальный приз от Visa 3, Специальный приз от Visa 4** считаются первые Игровые номера, следующие за номерами Победителей **Приза 1, Приза 2, Специального приза от Visa 1, Специального приза от Visa 2, Специального приза от Visa 3, Специального приза от Visa 4.**

11.7. Итоги розыгрыша призового фонда Рекламной игры фиксируются в Протоколе комиссии, который составляется и подписывается присутствующими членами комиссии.

11.8. Победители уведомляются Организатором посредством звонка на номер мобильного телефона, указанный при регистрации в Рекламной игре, в течение 3-х рабочих дней с момента выигрыша.

11.9. Результаты розыгрыша будут опубликованы на Сайте в течение 2 (двух) рабочих дней после проведения розыгрыша.

**12. Порядок выдачи призов:**

12.1. **Выдача призов согласно п. 8 таблицы № 2 Победителям розыгрышей Рекламной игры осуществляется в срок не позднее 07.12.2023.** Сумма **Приза 2** будет перечислена на предоставленные Победителями действующие расчетные счета в белорусских рублях, доступ к которым обеспечивается банковской платежной карточкой. Победители должны предоставить сведения о своих действующих расчетных счетах в белорусских рублях до 28 ноября 2023 г., отправив сообщение на электронный адрес: trivisionon@gmail.com или на телефон/факс Организатора (017) 209-90-01.

12.2. Для получения **Приза 1, Специального приза от Visa 1, Специального приза от Visa 2, Специального приза от Visa 3,. Специального приза от Visa 4.** Победителям необходимо предоставить копию страниц паспорта 25, 31-33, или копию страниц 3, 15-17 вида на жительство, или двухстороннюю копию биометрического вида на жительство, или двухстороннюю копию ID-карты до 28.11.2023 г. любым из указанных способов:

- письмом на электронный адрес: trivisionon@gmail.com;
- при обращении в офис Организатора по адресу: г. Минск, Пр. Независимости, 11/2, офис 328. Суммы **Приза 1, Специального приза от Visa 1, Специального приза от Visa 2, Специального приза от Visa 3,. Специального приза от Visa 4** будут перечислены на предоставленные Победителями действующие расчетные счета в белорусских рублях, доступ к которым обеспечивается банковской платежной карточкой. Победители должны предоставить сведения о своих действующих расчетных счетах в белорусских рублях до 29 ноября 2023 г., отправив сообщение на электронный адрес: trivisionon@gmail.com или на телефон/факс Организатора (017) 209-90-01.

12.3. Призы не подлежат замене.

12.4. Организатор несет все права и обязанности по уплате подоходного налога в бюджет Республики Беларусь. Начисление, удержание и перечисление подоходного налога проводится в порядке, установленном Особенной частью Налогового кодекса Республики Беларусь.

12.5. Ответственность Организатора по выдаче призов ограничена исключительно вышеуказанным количеством и видами этих призов.

12.6. В случае если Победители **Приза 2** не выполнят действия, указанные в п. 12.1, в установленные сроки, либо с Победителями **Приза 2** не удается связаться по 24.11.2023 г. включительно и уведомить о выигрыше из-за некорректных данных, указанных на регистрационной форме, либо был предоставлен письменный отказ от получения приза, победители утрачивают право на получение приза, право на получение приза переходит резервному Победителю Приза 2. Резервный Победитель уведомляется об этом не позднее 29.11.2023 г., посредством СМС-сообщения и звонка на номер мобильного телефона, указанный при регистрации в Рекламной игре. Для получения **Приза 2** Резервному Победителю необходимо предоставить сведения о своем действующем расчетном счете в белорусских рублях до 01 декабря 2023 г., отправив сообщение на электронный адрес: trivisionon@gmail.com или на телефон/факс Организатора (017) 209-90-01.

12.7. В случае если Победители **Приза 1, Специального приза от Visa 1, Специального приза от Visa 2, Специального приза от Visa 3, Специального приза от Visa 4** не выполнят действия, указанные в п. 12.2, в установленные сроки, либо с Победителями **Приза 1, Специального приза от Visa 1, Специального приза от Visa 2, Специального приза от Visa 3. Специального приза от Visa 4** не удается связаться по 24.11.2023 г. включительно и уведомить о выигрыше из-за некорректных данных, указанных на регистрационной форме, либо был предоставлен письменный отказ от получения приза, победитель утрачивает право на получение приза, право на получение приза переходит резервным Победителям **Приза 1, Специального приза от Visa 1, Специального приза от Visa 2, Специального приза от Visa 3,. Специального приза от Visa 4.** Резервные Победители уведомляется об этом не позднее 30.11.2023 г., посредством СМС-сообщения и звонка на номер мобильного телефона, указанный при регистрации в Рекламной игре.

12.8. Для получения **Приза 1, Специального приза от Visa 1, Специального приза от Visa 2, Специального приза от Visa 3, Специального приза от Visa 4** Резервным Победителям необходимо предоставить копию страниц паспорта 25, 31–33, или копию страниц 3, 15–17 вида на жительство, или двухстороннюю копию биометрического вида на жительство, или двухстороннюю копию ID-карты до 01.12.2023 г. любым из указанных способов:

- письмом на электронный адрес: trivisionon@gmail.com;
- при обращении в офис Организатора по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 11/2, офис 328. Суммы **Приза 1, Специального приза от Visa 1, Специального приза от Visa 2, Специального приза от Visa 3, Специального приза от Visa 4** будут перечислены на предоставленные резервными Победителями действующие расчетные счета в белорусских рублях, доступ к которым обеспечивается банковской платежной карточкой. Резервные Победители должны предоставить сведения о своих действующих расчетных счетах в белорусских рублях до 02 декабря 2023 г., отправив сообщение на электронный адрес: trivisionon@gmail.com или на телефон/факс Организатора (017) 209-90-01.

В случае если любой из призов из таблицы № 2 остается невостребованным, он возвращается Организатором Заинтересованным лицам.

12.9. Ответственность Организатора по выдаче призов ограничена исключительно Призовым фондом, указанным в п. 7 настоящих Правил.

Организатор не оплачивает Участникам расходы, связанные с проездом к месту розыгрыша, а также к месту получения приза.

**13. Наименование печатного издания средства массовой информации для публикации Правил и результатов розыгрыша, сроки публикации.**

13.1. Правила Рекламной игры подлежат публикации в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

13.2. Результаты розыгрышей Рекламной игры подлежат публикации в газете «Звязда» не позднее 5 декабря 2023 г.

13.3. Имена Победителей розыгрышей призов Рекламной игры будут опубликованы на Сайте в течение 2 (двух) рабочих дней после проведения розыгрыша.

**14. Права и обязанности Участников Рекламной игры.**

Участники Рекламной игры при заполнении регистрационной формы на Сайте обязаны вводить достоверную информацию. Организатор не несет ответственность за достоверность данных, внесенных Участниками Рекламной игры в регистрационную форму, а также за последствия внесения Участником Рекламной игры недостоверной информации в регистрационную форму.

**15. Порядок предоставления информации по вопросам проведения Рекламной игры.**

15.1. Все возможные вопросы и претензии Участников Рекламной игры в отношении организации и условий передачи Призов должны быть адресованы Организатору Рекламной игры по адресу: 220030, г. Минск, пр-т Независимости, 11/2, офис 328. Контактный телефон (код) (17) 209-90-03.

15.2. Организатор не вступает в споры между Участниками Рекламной игры относительно определения собственника выигранного приза и/или претендентов на получение приза.

**16. Иные условия.**

16.1. Споры между Организатором и Участниками Рекламной игры рассматриваются согласно законодательству Республики Беларусь.

16.2. Организатор не несет ответственность за невозможность связаться с Участником Рекламной игры в случае недостоверной информации, предоставленной Участником при регистрации в Рекламной игре.

*Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 4358 от 29 сентября 2023 года, выданное Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь»*

# ДРАПЕЖНІК ЦІ КВЕТКА?

## Знішчыць нельга сачыць

**Адзін з найважнейшых кірункаў навядзення парадку на зямлі — мерапрыемствы па рэгуляванні і распаўсюджванні колькасці інвазійных раслін, найперш баршчэўніку Сасноўскага і сумніку канадскага. Сачыць трэба нават за ростам дзьмухаўцоў, якія хай і не такія агрэсіўныя, але ж без належнага нагляду здольныя захапіць гарадскія газоны і паркі, таму камунальнікі і зелянбудаўцы апрацоўваюць газоны ад гэтых кветак.**



### ЗАРАСТАЕ ДВОР? МОЖАШ АТРЫМАЦЬ ШТРАФ

Насенне баршчэўніку валодае высокай усходжасцю на працягу доўгага часу (восем—дзесяць гадоў), што абцяжарвае барацьбу з ім. На вызваленай ад захопніка тэрыторыі баршчэўнік некаторы час можа не расці і яе нават выключаюць з плана абследавання, а праз тры гады захопнік можа вярнуцца, прарosшы з насення, прыхаванага ў зямлі, сцвярджаюць эксперты.

Спецыялісты Мінпрыроды кантралююць, як выконваецца план па барацьбе з драпежнымі раслінамі. Мінскім гарадскім камітэтам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, напрыклад, складзены 31 пратакол на суму каля 11 тысяч беларускіх рублёў за парушэнні ці несвоечасовае або няпоўнае выкананне задач па абыходжанні з інвазійнымі відамі.

— Для барацьбы з імі прымяняюцца механічны, хімічны і камбінаваны спосабы. На пачатак года плошча росту баршчэўніку складала 18,21 гектара, а сумніку — 156,44 гектара, — падзялілася **Таццяна ДУБІК, намеснік старшыні Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя**. — Цяпер якраз абследуюцца месцы росту інвазійных раслін разам з прадстаўнікамі Акадэміі навук, якія дадуць рэкамендацыі аб эфектыўнасці прынятых землекарыстальнікамі мер па рэгуляванні колькасці драпежных раслін. Ужо ёсць папярэдняя інфармацыя пра змяншэнне колькасці баршчэўніку на асобных тэрыторыях, а на днях з'явяцца новыя дакладныя лічбы, наколькі паменшала плошча, займаная агрэсарамі.

### ПРЫГОЖЫ І НЕБЯСПЕЧНЫ...

Калі шкоднасць баршчэўніку ўжо ні ў кога не выклікае сумневу, то сумнік дзякуючы яго жоўтым суквеццям дагэтуль лічыцца прыгожай кветкай. Яго нават называюць асенняй мімозай і часта ўпрыгожваюць ім школьныя букеты да 1 верасня, дадаючы да астраў ды гладыёлусаў, зрэзаных на падворках. Ды што там, ён нават і належыць да сямейства астравых. Нягледзячы на ўсё гэта, кветка застаецца драпежнікам. Па ступені небяспечнасці для наваколля і дабрабыту чалавека спецыялісты ставяць сумнік нароўні з баршчэўнікам і каларадскім жуком.

Закон аб раслінным свеце ў частцы барацьбы з інвазійнымі раслінамі распаўсюджваецца на тэрыторыі за выключэннем прыватных домаўладанняў, патлумачыла Таццяна Дубік:

— Даюцца папярэджанні і рэкамендацыі, праводзіцца тлумачальная работа з грамадзянамі аб недапушчальнасці вырошчвання і распаўсюджвання гэтай расліны. Сумнік насамрэч вельмі агрэсіўны. Пасадзіўшы ў кветніку тры кусты гэтай расліны, неўзабаве можна страціць усе астатнія культурныя расліны, якія проста загінуць ад агрэсара.

Кожны куст сумніку дае да 100 тысяч каліў насення, якое валодае высокай усходжасцю. Больш за тое, з часам карані жоўтага захопніка пачынаюць выдзяляць у глебу атрутныя рэчывы, якія глушаць рост іншых раслін.

Патрабаванні да рэгулявання інвазійных відаў раслін замацаваны правіламі добраўпарадкавання тэрыторый, якія зацверджаны пастановай Савета Міністраў, удакладніла **Таццяна БАС, намеснік начальніка аддзела кантролю за аховай і выкарыстаннем зямель, нетраў, біяразнастайнасці асабліва ахоўных прыродных тэрыторый Мінскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя**:

— У гэтых правілах прапісана, што за парушэнне правіл добраўпарадкавання на тэрыторыі прыватных падворкаў, у тым ліку за вырошчванне інвазійных відаў раслін або неправядзенне барацьбы з імі, прыцягнуць гаспадароў да адміністрацыйнай адказнасці могуць сельсаветы. На Міншчыне, на жаль, сустракаюцца падворкі, дзе даўно няма гаспадароў, а тэрыторыя сядзіб зарастае і баршчэўнікам, і сумнікам. Сельсавет мае ўсе правы і падставы адшукаць новых уладальнікаў участка і выдаць прадпісанне, пасля чаго прыцягнуць да адміністрацыйнай адказнасці за невытрымліванне правіл добраўпарадкавання.

### СМЕЦЦЕ, ВОГНІШЧА, СТАЯНКА НА БЕРАЗЕ

У рамках кантролю за выкананнем заканадаўства ў галіне аховы наваколля Мінскі гарадскі камітэт прыродных рэсурсаў таксама праводзіць шэраг мерапрыемстваў. Сёлета з гэтай мэтай было праведзена каля 270 кантрольных мерапрыемстваў, якія выявілі звыш дзвюх тысяч парушэнняў. Да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнуты і аштрафаваны 45 вінаватых асоб, а папярэджанне атрымалі больш за 245 асоб.

Раённыя інспекцыі Мінпрыроды ў рамках навядзення парадку на зямлі (у тым ліку абследаванняў тэрыторыі) сёлета правялі звыш 4300 кантрольных мерапрыемстваў. Было выяўлена 8250 парушэнняў, для ўстаранення якіх выдадзена 1489 прадпісанняў і рэкамендацый, накіравана 2529 інфармацыйных лістоў. Да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнута 400 асоб на суму 548 тысяч рублёў, папярэджанне вынесена 928 асобам.

Сярод найбольш распаўсюджаных парушэнняў: стаянка транспартных сродкаў бліжэй за 30 метраў да берагавой лініі, распальванне вогнішчаў на забароненых тэрыторыях, пакіданне смецця ў несанкцыянаваных месцах.

**Ірына СІДАРОК,**
**фота аўтара.**

Будзь у курсе!

# УВАГА: РЫБА ІДЗЕ НА «ЗІМОВЫЯ КВАТЭРЫ»

**За яе здабычу на зімавальных ямах з 1 кастрычніка да 15 красавіка, а таксама за замах на такую здабычу прадугледжана адміністрацыйная адказнасць у выглядзе штрафу ў памеры ад 10 да 30 базавых велічынь.**

Як нагадвае Дзяржаўная інспекцыя аховы жывёльнага і расліннага свету, акрамя таго, за здабытую рыбу ці замах на такую здабычу давядзецца аплаціць шкоду, прычыненую навакольнаму асяроддзю, разлічаную на падставе такс, вылічаных у трайным памеры па кожным здабытым відзе рыб.

Зімоўка — сезонны перыяд у жыцці рыб, які суправаджаецца значным зніжэннем узроўню жыццядзейнасці і абмену рэчываў. У іх запавольваюцца працэсы росту, інтэнсіўнасці харчавання, адбываецца тармажэнне рэакцый на раздражняльнікі, запавольваецца дыханне і іншае. Цеплалюбівыя рыбы, такія як лешч, карп, лінь і іншыя, у кастрычніку—лістападзе збіраюцца разам у касякі і адпраўляюцца ў месцы масавай зімоўкі, так званыя зімавальныя ямы. У іх трапляе рыба звычайна аднаго віду і ўзросту, што забяспечвае найлепшыя ўмовы для перазімоўкі.

У стаячых вадаёмах зімавальныя ямы прывязаныя да вусцяў рэк, якія ўпадаюць у іх, і раўчукоў, а таксама да месцаў выхаду падводных крыніц, бо вада там лепш узбагачаецца кіслародам і лепш змешваецца, у праточных вадаёмах — да глыбакаводных месцаў з павольным цячэннем.

Зімавальныя ямы лёгка аблоўліваюцца, што патрабуе строгага захавання мер па іх ахове. З мэтай прадухілення масавага вылаву рыбы ў перыяд яе зімоўкі Правіламі аматарскага рыбалоўства і Правіламі вядзення рыбалоўнай гаспадаркі, зацверджанымі Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 21.07.2021 года № 284, устаноўлена забарона на аматарскую і прамысловую лоўлю рыбы на зімавальных ямах з 1 кастрычніка. Пералік зімавальных ям з указаннем іх каардынат і граніц зацверджаны пастановай Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання і Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ад 15 сакавіка 2023 года № 34/2.



**Сяргей РАСОЛЬКА.**